Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За границай: на 1 г.—4 р., на 6 мес—2 р., 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. залінейу малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна также падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 14 чэрвеня (іюня) 1912 г. № 24.

*Вільня, 14 (27) чэрвеня 1912 г.*

Калі кінем вокам назад—гадоў за пяць—шэсць і прыпомнім, с чаго складалася тады ўся беларуская пісьменнасць, дык можна сьмела сказаць, што цяпер беларускае національнае адраджэньне пайшло далёка ўпярод. *Тады* у кніжках і брошурах невялікі гурток людзей звертаўся да многамільённай грамады беларускаго народу, будзіў яго, клікаў да жыцьця, клікаў, каб „*народ свой голас даў*“. *Цяпер*—на страніцах „Нашай Нівы“, ў вершах-песьнях і асобных кніжках з'явіліся *думкі самога народу*, голас народу. З глыбіні душы і сэрца плыве гэты голас і нейкім дзіўным чарам прыцягівае да вялікай, але цяжкой працы дзеля адраджэньня беларусоў нават тых сыноў нашаго народу, каторые, зрабіўшыся інтэлігентамі, блізка зусім загубілі сваё національнае „я“, бытцым змянілі душу сваю на чужую. А поруч з гэтым нарастае новае пакаленьне: гэта моладзь, каторая ешчэ здабывае сабе навуку,—і гэтае пакаленьне будучых дахтароў, адвакатоў, інжэнероў і грамадзкіх працаўнікоў ужо крэпка дзержыцца беларушчыны і, карыстаючы з дабыткоў чужой культуры, працуе дзеля будоўлі сваей беларускай культуры.

Так расьце беларуская національно-сьведомая інтэлігенція. Каб далей развівацца, каб развіваць сваю мову і свае „творчэскіе сілы, ей дагэтуль не хватало поля. І марнавалася багата такіх сіл, як нябошчык С. Полуян, каторые, ні маючы дзе памясьціць свае думкі і творы—ўжо чыста *інтэлігенцкіе*, замаўкалі зусім. Ня дзіва: едыная народная газэціна „Наша Ніва“, пісаная найболей людзьмі вёскі і для вёскі, не магла змясьціць у сабе ўсяго, што тварыла наша маладая інтэлігенція для сябе самой А іншых выдавецтв не было.

Каб знайсьці прыпынак для творчэства беларускай інтэлігенціі, не раз падыймалася думка выдаваць беларускі месячнік на падобу расейскіх. Але думка аставалася думкай, а споўніць яе не удавалося.

Цяпер гэта патрэба інтэлігенцкаго выдавецтва часьцю здаволена: у Пецербурзе пачалі выходзіць зборнікі „Маладая Беларусь“.

Мы ўжо дасталі першы зборнічэк „Маладой Беларусі“. Дзьве рэчы кідаюцца ў вочы чытача, калі возьме яго ў рукі: „На дарозі да новаго жыцьця“ А. Новіны і „Сон на кургане“ Я. Купалы.

Абшырная стацьця А. Новіны—гэта проба раскрыць тые пуціны, па каторых ішлі і ідуць беларусы „да новаго жыцьця“. Гэта болей-меней поўны абраз беларускаго руху, цікавы для кожного, хто хочэ зразумець з'явішчэ прабуджэньня ад векавога сну нашаго народу.

„Сон на кургане“—чатыры драматычные абразы—абраз жыцьця беларуса, якое ёсць цяпер, з яго перэжываньнямі, думкамі, павер'ямі,—абраз душы беларуса. Янка Купала, як сын вёскі, адбівае ў сябе яе псыхіку; гэта асобенная псыхіка, прыбраная ў паэтычные формы, і дае цэну творам Купалы, а „Сон на кургане“ побоч з „Адвечнай песьняй“ займае між імі найбольш выдатнае мейсцо.

Мы ня будзем задзержывацца над іншымі невялічкімі творамі, памешчэнымі ў першай кніжцы „Маладой Беларусі“. Скажэм толькі, што новае выдавецтво дае беларусам сур'ёзную духоўную страву, скарыстаць с каторай павінен кожын сьведомы беларус.

## За апошні тыдзень.

### З Расеі.

### У Думе і каля Думы.

Трэйцяя Дума дажыла свой век: прайшло пяць гадоў, на каторые яе выбралі, і 9 юня Дума была распушчэна.

Цяпер ужо можна зрабіць поўны агляд таго, што за гэтые пяць лет жыцьця зрабіла Дума. Але, аткладаючы гэта да чародных нумэроў, мы павінны даць атчот з апошніх заседаньнёў Думы, каторые шмат памагаюць зразумець яе характэр.

На гэтых заседаньнях першае мейсцо заняла справа асыгноўкі 502 мільёноў руб. на будоўлю ваеннаго флота. У пяць гадоў правіцельство маніцца пабудаваць некольні новых броненосцоў і вярнуць расейскаму флоту даўнейшую сілу. Левая палавіна Думы даводзіла, што ўсе надзеі на гэта надта няпэўные: перш-наперш праз пяць гадоў, пакуль расейскіе броненосцы будуць рабіць павэдлуг старых пляноў, заграніцай прыдумаюць новые і лепшые спосабы будоўлі, ды пры цяперашніх парадках у марскім міністэрстве нет ведама, як пойдзець работа. Ешчэ даводзілі, што Расеі німа патрэбы гнацца за такім вялікім флотам, бо яна на моры на нікога нападаць не збіраецца: калі ей прыйдзецца ваеваць на моры, то хіба баронячыся ад напасці чужынцоў, а дзеля абароны такога флоту, як хочэ міністэрства, ня трэба. А для ґасударства с так слаба развітым экономічным жыцьцём, як Расея, кінуць на броненосцы 502 мільёны нават і не пад сілу.—Але, ня гледзячы на ўсё гэта, Дума споўніла жаданьне прадседацеля міністроў і асыгноўку на флот зацьвярдзіла.

Другая цікавая справа была вось якая. Пасьля убіўства Юшчынскаго, калі праўдзівые убіўцы здалелі схавацца, падазрэньне кінулі на жыдоў, выцягнуўшы старую і нягодную байку аб тым, бытцым жыды „на мацу“ ужываюць хрысьціянскую кроў. Карыстаючы з гэтаго, пакуль справа ня выяснілася, „правые“ зрабілі аб ёй запрос у Думе, думаючы пры нагодзі паганбіць жыдоў перад усей Расеей і нацкаваць на іх хрысьціян. Але-ж на бяду „правым“ аткрылося, што не жыды, а хэўра злодзеёў (с хрысьціян) забіла Юшчынскаго. Тады ўжо „левые“ сталі наседаць на Думу, каб скарэй разглядзела запрос „правых“, бо тады ўсе убачылі, што гутаркі чорнасоценцоў аб хрысьціянскай крыві ў мацы жыдоўскай—гэта чыстая брэхня. Але Дума разгледаць запросу ня згодзілася, вельмі уцешыўшы гэтым „правых“ і ўсіх іх хаўрусьнікоў.

Адно толькі думскае пастанаўленьне нездаволіло „правых“ і „націоналістоў“, а асабліва духавенство: на апошнім заседаньні Дума адмовілася разгледаць справу аб асыгноўцы грошы на цэркоўна-прыхадзкіе школы, і гэтак грошы не далі.

### Роспісь ґасударственых даходоў і расходоў на 1912 г.

Пасьля Думы роспісь гасударственых даходоў і расходоў на 1912 год разбіраў Гасударственны Савет, і толькі тады яе зацьвярдзіў Гасудар. Як ведама, Дума крыху паменшыла расходы, але Гас. Сав. шмат паправак Думы аткінуў. Усё-ж такі бюджэт урэзан $22^{1/2}$ мільёны руб. проці таго, што прасіло правіцельство.

Усіх расходоў налічэна 3.001.919261 руб. (=3 мілярды=3.000 мільёноў з лішкам); гэтулькі-ж павінна быць і даходу. Даходы гэткіе:

1) **звычайные даходы:**

| | |
|---|---|
| простые падаткі | 230.644.866 руб. |
| „косвеные“ налогі (акцыз і інш.) | 634.896.100 „ |
| пошліны | 191.847.376 „ |
| рэгаліі (даходы правіцельства) | 878.923.700 „ |
| казённых маёнткоў і капіталоў | 829.210.317 „ |
| с прадажы казённаго дабра | 1.800.380 „ |
| выкупные платы | —806.200 „ |
| зварот грошы, выданых на расходы казначэйства | 112.533.660 „ |
| іншые даходы | 15.856.662 „ |
| разам звычайных даходоў | 2.896.519.261 „ |

2) **незвычайные даходы:**

| | |
|---|---|
| грошы, паложэные ў гасударств. банк на вечные часы | 2.400.000 „ |
| зварот грошы, выданых насяленьню на падмогу харчамі і на насеньне і ўзятых с казны, як пазыка | 3.000.000 „ |
| разам незвычайных даходоў | 5.400.000 „ |
| 3) **свабодных грошы гасударственаго казначэйства** | 100.000.000 „ |
| Усяго даходоў | 3.001.919.261 „ |

Расходы вось якіе:

1) **звычайные расходы:**

| | |
|---|---|
| на міністэрство Імпэратарскаго Двара | 16.359.595 „ |
| на вышэйшые гасударственые установы (гас. дума, савет, і т. п.) | 8.147.511 „ |
| на Сынод | 40.129.979 „ |
| на міністэрство унутраных дзел | 172.393.990 „ |
| на міністэрство фінансоў | 426.860.974 „ |
| на міністэрство юстіціі (судоў) | 82.616.422 „ |
| на міністэрство заграничных спраў | 6.569.190 „ |
| на міністэрство народнай прасьветы | 117.537.360 „ |
| на міністэрство дарог | 553.615.641 „ |
| на міністэрство тарговлі і промыслоў | 49.235.728 „ |
| на главнае упраўленьне землеустройства і сельскай гаспадаркі | 116.635.647 „ |
| на главнае упраўленьне гасударств. конназаводства | 2.203.879 „ |
| на ваеннае міністэрство | 492.933.426 „ |
| на марское міністерство | 159.145.970 „ |
| на гасударственны кантроль | 11.034.948 „ |
| выплаты за гасударственые даўгі | 404.521.546 „ |
| на неспадзеваные патрэбы | 10.000.000 „ |
| разам звычайных расходоў | 2.669.941.806 „ |

2) **незвычайные расходы.**

| | |
|---|---|
| расходы с прычыны японскай вайны | 410.454.— „ |
| на гаспадарскіе і опэраціонные расходы ваеннаго міністэрства | 70.000.000 „ |
| на будоўлю новых жалезных дарог | 110.215.222 „ |
| на выдачу прыватным таварыствам жалезных дарог | 1.965.742 „ |
| выкуп праў прыватных асоб на прадажу гарэлкі | —240.000 „ |
| на выплату гасударственаго даўгу | 149.146.037 „ |
| разам незвычайных расходоў | 331.977.455 „ |
| **а ўсяго расходоў** | **3.001.919.261 руб.** |

### З заграніцы.

Хаўрус між Францией і Англіей вельмі устрывожыў суседку французоў—Немеччыну. І вось ізноў пачынаюцца гутаркі аб тым, каб завясьці дружбу між немцамі і англічанамі: гэмымі днямі паехаў у Лондон, сталічнае места Англіі, новы нямецкі пасол, Маршаль фон-Бібэрштэйн, катораму урад і загадаў працаваць тамака дзеля зближэньня Англіі і Немеччыны.

Ёсць і другіе прычыны, дзеля каторых вялікім дзержавам прыходзіцца збліжацца: гэта ўсё тая-ж вайна Італіі с туркамі. Калі італьянцы напалі на Трыполіс, іншые дзержавы абвесьцілі, што яны да тэй справы мешацца ня будуць, але не пазволяць Італіі перэнасіць вайну з Афрыкі у Эўропу. Тымчасам італьянцы бытцым насьмехаюцца над імі: нідаўна напалі на Дарданэльскі праліў, а цяпер, як забраць той праліў у свае рукі ім не удалося, захапілі некольні турэцкіх астравоў ужо каля берагоў Эўропы. Вялікіе дзержавы павінны здзержаць сваё слова, дадзенае туркам, але тады прыдзецца востра выступіць проці італьянцоў. Калі-ж Італіі не перашкодзяць, дык ясная справа, што яна папрабуе шмат чаго урваць ад Турэччыны, а за ею пойдуць і другіе дзержавы; тады і можэ прылучыцца тое, чаго ўсе баяцца: агульная вайна між усімі эўропэйскімі дзержавамі, каторые згодай ня скончаць дзяліцьбы турэцкай спадчыны...

Забіраючы беззашчытные ту-

рэцкіе астравы, каторых бараніць абецаліся туркам „дзержавы-апекункі“, італьянцы маняцца прымусіць Турэччыну атступіцца ад Трыполісу. Туркі гэта разумеюць, але ім будзе шмат выгадней, калі пачнецца сварка між Італіей і другімі гасударствамі, чым самой бараніць свае астравы, ні маючы ваеннаго флоту. І яна сядзіць ціха: толькі ўсімі сіламі стараецца непаддацца у Трыполісе. Яна ўжо нікому ня веріць: ня верыць немцам, бо яны, як хаўрусьнікі Італіі, не перашкодзілі італьянцам пачаць вайну; ня верыць і Расеі, бо на берэзі Чорнаго мора, пры уходзі ў Дарданэльскі праліў, паставіла новые гарматы, паверненые ў наш бок. І толькі ў сварцы другіх гасударств між сабою бачыць для сябе ратунак.

Нездаволен паступкамі эўропэйскіх дзержаў і Кітай. Там ўсё ешчэ не умацаваўся акуратны парадак, ды ў гэтым вялікую перашкоду робяць эўропэйцы, каторые навялі ў Кітай сваё войско. Вось, народ, бачучы, што новы урад ня можэ пазбыцца апекі чужынцоў, не шануе таго ураду. З гэтай прычыны кітайскае правіцельство маніцца прымусіць расейскае войска, каб пакінуло Манджурыю і Манголію і каб шанавало незалежнасць Кітайскай зямлі. Тым часам ёсць у Расеі такіе „патрыоты“, як граф Бэннігсэн, каторые падбіваюць правіцельство на вайну с Кітаем; ведама, такіе рады супакоіць кітайцоў ня могуць: яны запраўды баяцца, што Расея на іх маніцца напасьці.

## З жыцьця нямецкіх вучыцелёў.

У Бэрліне, сталічным горадзі Немеччыны, адбыўся з'ед народных вучыцелёў. Прыехало больш 8.000 душ. Горад пічыра вітаў гэтых сяўцоў знаньня між народам, а імператар Вільгэльм загадаў устроіць для вучыцелёў прэдстаўленьне у сваім тэатры і сам туды паехаў.

Нямецкіе народные вучыцелі ўжо ня першы раз збіраюцца на з'езд, каб пагукаць аб сваіх справах і выказаць голасна свае жаданьня. Але не заўсёды мелі яны такую волю. Як пішэ „Школа и Жизнь“, у 1854 гаду прускае міністэрство забараніло вучыцелём бываць на з'ездах, але праз 15 год—у 1869 г.—міністэр народнай прасьветы сам вітаў з'езд, а ў 1873 гаду першы міністэр фон-Бісмарк прыслаў з'езду тэлеграму, называючы вучыцелёў сваімі „дарагімі таварышамі у змаганьні“ (—гэта было пасьля таго, як Немеччына зваевала Францію). Пасьля ізноў насталі дрэнные часы: у 1881 гаду прускі міністэр не даваў вучыцелём отпускоў на з'езд; а ўсё-ж такі і гэта мінулося, і ў 1888 г. другі міністэр Прусіі клікаў благаслаўленьне неба на работы з'езду. І цяперашні нямецкі урад, разумеючы, якую вялікую вагу мае сьвядомая і шчырая праца народнаго вучыцеля, ня робіць вучыцельскім з'ездам ніякіх перашкод.

Там, дзе народныевучыцелі маюць поўную волю збірацца на з'езды, дзе ім німа патрэбы баяцца, што нехта можэ іх з'езд закрыць, —яны ўсю сваю увагу звертаюць на тое каб як найлепш нарыхтаваць справу навукі народу. Яны апрацовываюць способы, каб народны вучыцель сам мог болей навучыцца, каб дзеля гэтаго для вучыцелёў аткрывалі унівэрсытэты, каа ім за працу плацілі гэтулькі, каб па-людзку маглі жыць.

Нам ешчэ далёка да таго, што маюць немецкіе народные вучыцелі, але прыйдзе час, што і мы гэтаго дачэкаемся. А пакуль што, пакуль нашы вучыцелі ня могуць злучацца ў хаўрусы, ня могуць рабіць з'ездоў,—іх павінна з'еднаць вялікая і сьвятая думка аб службе для свайго народу, думка аб тым, што народны вучыцель працуе не дзеля „дваццатаго чысла“, а пастаўлен „сеяць разумнае, вечнае“, аткрываць народу сьвет праўды, навукі і разбіваць тые путы, які ускладае на кожнаго чэлавека цемната. Хто гэта зразумеў, ў каго у сэрцы запалілося жаданьне шчыра служыць свайму народу, той заўсягды здалее знайсьці дарогу, па якой трэба ісьці, хаця-бы ён быў адзін, хаця-бы ня мог зыйсьціся з сваімі таварышамі па працы дзеля супольнай гутаркі аб сваіх задачах і павіннасьцях, аб способах працы для народу.

**Н.**

## Край с пяцьцю націямі.

На зямлі беларускай жывуць пяць відных націй, ня лічачы дробных, як татары, караімы. Некатарые національные культуры, як расейская, польская, і часьцю жыдоўская, маюць ужо вялікае національнае багацтва, добра развітую літэратуру, духоўнае жыцьцё; другіе, як адвечные жыхары гэтай зямлі—беларусы, літоўцы, толькі пачынаюць работу дзеля развіцьця сваей націанальнай культуры. Усе гэтые пяць племён не збіраюцца пакідаць Беларусь і Літву: прыдзецца і ім і іх унукам і праўнукам таптаць зямлю і жыць блізкімі суседзямі. З усіх краёў на сьвеці ім наша старонка найблізжэй да сэрца, бо можэ быць толькі адна родная матка, а ня дзьве. І кожын з нашаго краю кажэць: „Я—паляк, або расеец, або іншы, але—тутэйшы.

Мы ведаем, напрыклад, такі прыпадак: два беларускіе народные вучыцелі заўсягды казалі, што яны не беларусы, але „расейцы“. Ну, расейцы, дык расейцы, нічога ім ня зробіш. Пайшлі раз вучыцелі нашы у Маскву пехатой; як ужо ўвайшлі ў Расею, спатыкацца пачалі з расейскімі вучыцелямі, а тые пытаюцца: „Вы, мусіць, палячкі?“—„Не, мы рускіе!“ —атказываюць нашы скрыўджэные хлопцы.—„Як рускіе!? То-ж у вас і гутарка нейкая ня руская!“ Прышлося вучыцелям прыцісну-тым да сьцяны прызнацца, што яны „беларусы!“

Апаведаў нам раз адзін стары палкоўнік, што у часе вайны выслалі адгэтуль чэлавек з 20 афіцэроў некуды ў Пензу, ці што; там спаткаліся яны з афіцэрамі, каторые вырасьлі ў расейскіх губэрнях. Пазнаёміліся, але адразу не маглі зыйсьціся, бо тутэйшые маюць і другіе фасоны гутаркі і дэлікатнасьці, хоць з расейскіх губэрній народ неяк больш размашысты і па прастаце с кожным трымаецца. Кончылася тым, што, калі зжыліся трохі, фасоны розные з нашаго краю падабаліся і прыняліся другімі.

Калі тутэйшы паляк трапіць у Варшаву, то як бы ён ні лічыў, што гаворыць добра па польску, с першаго слова яму кажуць: „А, пан з Літвы!“ І ён бачыць, што палякі с Польшчы шмат розняцца ад нашых палякоў, хоць у іх і рэлігія адна, і культура бліжэй.

Кажуць, што жыды па ўсяму сьвету тые самые; а хто ездзіў па сьвеці, той заўважыў-бы, што толькі эдукаванаму жыду ўсё роўна, дзе жыць, а простые жыды любяць свой край і можэ менш, чым якая другая нація, перэезджаюць з мейсца на мейсцо. Украінскіе жыды сідзяць на Украіне і да нас ня едуць; беларускіе жыды едуць толькі у Амэрыку, а адтуль ізноў у сваё мястэчка; польскіе жыды моцна адбіваюцца ад „літвакоў“ ва ўсім; с пад Рыгі жыды, жывучы паміж латышоў і немцоў, саўсім інакшые, як жмудзкіе і т. д. Усякай гэтай націі беларуская земля і суседзі панакладалі сваё клеймо, але найбольшае клеймо ўсё-ж такі паставіў беларускі народ усім „тутэйшым“ палякам і рускім: ён надаець способ гутаркі (тэмбр і такт мовы); десяцімільённае беларускае морэ абмываець кругом усякую націю, і ўсім ім прыходзіцца да гэтаго мора прыглядацца і да яго цьвёрдых старадаўніх звычаёў і фасоноў прырыхтовывацца.

Ад супольнаго жыцьця неколькіх розных народоў край мае шмат карысьці: яго агульная культура падыймаецца. Кожны вядзець штодзеннае змаганьне за сваю національную ідэю, і там, дзе ідзець такая вайна, што дзень нешта новае вытвараецца; змаганьне ёсць разам і вытварэньня новаго.

Прыходзілося нам спатыкацца з расейцамі; вось яны і гаварылі: „нам у расейскіх гарадох німа аб чым гаварыць, німа чым займацца; у вас шчасьлівы край, у вас заўсягды ёсць багатая жывая пра-

## Зло не заўсёды—зло.

Цэлае лета вісеў жолуд на старым дубе. Бог ведае, як далей, а пакуль ён быў малы, вялікаго гора заўнаць яму не прышлося. Праўда, на яго тады ніхто не зварачаў і увагі: як бы яго і на сьвеці не было. Толькі сонейко, выплыўшы з-за лесу, узіралося на яго і пеставало сваім цяплом, бы тая маці. А калі, бывало яно прыпекало надта горачэ—любоў часта пераходзіць свае граніцы,—маленькі жалудок хаваўся у цяньку густых лістоў, як пан пад парасонам, і яму заўсёды было добра.

Так і вісеў ён, ні для кога незаметны.

Але-ж ў рэшці вісець яму абрыдла.

Яно такі і праўда: як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай зьмены, то яно лёгка перэстае быць дабром. Гэтак было і з жолудам: захацелося яму другога жыцьця; так і цягнула яго саскочыць з галіны і пакачацца па мяккой зямлі. Не раз ён ужо парываўся зрабіць гэта. Сказаўшы праўду, трохі з ветру гарыць сьвет. Бывала, чуць што ўзыйдзе сонцэ, гэты жартаўнік і штукар-вецер зараз і падкрадзецца, але так, каб ня чуў стары дуб, і пачне баламуціць дубовых сынкоў. Што казаў жолуд, ня ведаю. Болей сьмелы вецер гаварыў грамчэй, і вось што ён шэптаў раз жолуду.

— Дурны ты? я пражыў на сьвеці болей вякоў, як лістоў на гэтым дубе, і кажу табе: раз у цябе ёсць сіла, ты заўсёды знайдзеш способ жыць на сьвеці, і ты праб'еш сабе дарогу—што жывое, жывым і застанецца.—

А стары дуб тым часам гаварыў так.—Сынок! патрывай ешчэ трошкі, падрасьці, ўздужай. О! ты ешчэ ня ведаеш, як цяжка жыць на сьвеці. Паслухай мяне старога. — Ведама бацька: шкада яму сына.—Не пускае бацька,—ціханька шэптаў жолуд на намову ветра.

І трэба-ж было, каб гэту гутарку прачула сьвіньня! Раз, ужо зусім пад восень, жолуд убачыў, як пад дуб, рохкаючы, трушком падбегала лапавухая асоба. Углядзеўшыся добра, жолуд абамлеў: на зямлі лежала шмат такіх-жэ, як і ён, жалудоў, і сьвіньня хрумстала іх без усякай жаласьці. На тое ж яна і сьвіньня, даруй Божэ грэх. З вялікаго страху бедны жолуд задрыжаў, вылузаўся з місячкі і упаў на зямлю у двух кроках ад сьвіньні! Але упаў ён як раз у тую яміну, што вырыла сьвіньня сваім ўласным доўгім лычом.

І вось што вышла: сьвіньня хацела паесьці жалуды—і памагла вырасьці аднаму жолуду, вырыўшы яму пасцельку. Жолуд на другі год прарос і стаў дубком, а сьвіньню людзі закалолі, і яна стала мясам.

**Тарас Гушча.**

## ЦМОК.

*Беларуская легенда.*

Дужа і дужа даўно гэта было; можа сто, можа дваста, а можа і болі гадоў.

Жыў у вёсцы Стрэльбы адзін старык; хто ён, аткуль—ніхто ня ведаў; звалі яго Сёмкам. Колькі гадоў меў Сёмка, ён і сам ня мог успомніць, бо ўжо дужа, дужа стары быў.

Прыйшоў сакавік, сталі мужыкі далотамі прабіваць і сьвердламі пракручываць дзіры у бярозах ды у клёнах, устаўлялі у дзіры латочкі і па іх пускалі сок у жбаны, гаршчкі—і поўнымі судзямі прынасілі дамоў, вялікіе кублы налівалі яго. Хто колкі хацеў,—пілі праз пост і ешчэ аставалося на вясну і лета.

Дужа многа ад гэтаго дрэў прападало марна. Бяроза на пагляд—цацка, а у сяродку адна парахня. Шкада стала Сёмцы дрэвоў і кажэць ён мужыкам: „Вот налійце бочку соку ды памацней забійце дно і ня рушце яе праз цэлы год“.

Мужыкі паслухалі Сёмку, бо ўжо дужа шанавалі яго.

Прайшоў год, Сёмка і кажэ: „Ну цяпер бярыце бочку с сокам і каціце падалей на папарнае поле і як можна больш збярыце мальцоў, ніхай кожны маець у руках якую небуць уручыну; калі бочку разабьеце, адтуль папаўзуць рожные гады і вужакі; глядзіце; бійце ўсіх, каб ніводная не ўцекла, бо дужа вялікая беда з гэтаго можэ здарыцца“.

Сабраліся людзі з усей вёскі, хто з аглоблінай, хто с перэкладзінай, хто с памялом, а хто з рыдлям-бытцым на вайну. Бочку атка-цілі далёка на поле на роўнае мейсца і разбілі.. Божухна мой, што толькі яны не ўбачылі: якіх там гадоў, вужакоў, жабоў, яшчуркоў не было! і кожная туравілася, каб хутчэй папасьць у лес ці у балота.

С пачатку людзі спужаліся, ажно каторые рынуліся уцекаць, але пасьля апомніліся і давай лупцаваць усю гэтую шпэць.

Доўга білі, здаецца усіх перабілі.

„Ну што, цяпер вы убачылі, што у соку ёсць і што вы пілі!“ сказаў Сёмка.

С таго часу стрэльбянцы перэсталі пускаць сок, а дзеля гэтаго і лес стаў папраўляцца.

Прайшоў год, прайшоў і другі, на Юрью выгналі скаціну ў поле, і як вядзецца, абкурылі яе зёлкамі, а самі мужыкі прыняліся за вясноўскую працу. Аж неяк гэта праз тыдзень у Ірмака прапаў ягнёнак. Усё поле, усе кусты

ца над нацыянальнымі пытаньнямі, і дзеля таго Заходні край куды байчэй жывець, як цэнтральная Расея!“

Уся беда толькі ў тым, што у нас нацыянальные змаганьня вядуцца часамі спосабамі некультурнымі, дзікімі, гвалтоўнымі; німа пацанаваньня да асобы чэлавека, да чужой нацыі, з лёгкім сэрцэм робяцца цяжкіе крыўды чужому нацыянальнаму гонару. Вазьміце некаторые нашы газэты; пачытаўшы іх, чэлавек дзівуецца: лаянка, абіда так і сыпяцца. — Мы маглі-бы ўзяць прыклад з газэт англійскіх: яны так дэлікатне вядуць спорку з сваімі праціўнікамі, бо сама англійская публіка прывыкла шанаваць чужую думку, хаця і цьвёрда стаіць за сваю.

Рэч зразумелая, што нацыянальные змаганьня павінны весьціся цьвёрдай рукой. Трэба, каб у нашым краю ўсякая нацыя гадавала і развівала сваю ідэю, але паставіла бы гранічные слупы, каб ня лезьці праз граніцу другой нацыі. Мы, беларусы, павінны браць ад усіх нацый усё добрае, што у іх ёсць: ад агульна-расейскай культуры—шырокіе ідэі дэмакратызму; ад палякоў—іх культурную практычнасць, эдукацію іх проста-хваравую любоў да сваей бацькоўшчыны, каторая можэ нам служыць прыкладам. Жыды ізноў прывыклі адзін аднаму памагаць і трымацца разам каб ня згінуць, праз усю сваю тысячэлетнюю цяжкую гісторыю; ад гэтаго яны маюць бо́льшую, чым другіе нацыі, прывычку да грамадзянскаго жыцьця; можэм і мы у іх павучыцца, прыгхядаючыся да іхняго грамадзянскаго жыцьця.

Калі наш край дачэкаецца ціхаго і згоднаго жыцьця ўсіх нацый і будуць праведзены справядлівые нацыянальные граніцы, тады развіцьце і духоўнае і матэр'яльнае высока падымецца, нават шмат вышэй, чым у мейсцох з адным толькі племенем.

**А. Ў.**

Фольварак Мігаўка.
10/VI—1912 г.

## Аб хаўрусах рэмесьнікоў.

Не багата прырода нашай Беларусі: земля рэдка дзе бывае добрая, а больш за ўсё землі у нас дрэнные і даюць малые ураджаі, ды і тэй дрэннай зямлі для многамільённаго селянства скупа; вось селянство нашэ, як той казаў, не жыве, а мадзее. Каб выбрысьці з беднаты і недастатку, патрэбны які-колечы заработак на старане. Заработак гэткі малая частка селян знаходзіць каля рубкі лясоў, дзе ешчэ які клак застаўся, а большая частка выежджае, шукаючы хлеба, ў чужые старонкі: у Сыбір, на Амур, ды ў гарады ўсяе Расеі на фабрыкі; а ешчэ іншые едуць за морэ у Амэрыку і Бразылію. Выежджаюць лепшые, байчэйшые, здатнейшые сілы, астаюцца слабейшые. Народ не павінен пры нормальных варунках пазбывацца лепшых сваіх сіл, але заховываць іх для сябе, для свайго узросту і развіцьця. Як-жэ мы можэм захаваць гэтые лепшые свае сілы, каторым не хапае куска хлеба у сваей старане? Не хапае работы для крэпкіх рук?

Але далёка ешчэ ня ўсе багацтвы нашай зямлі выкарыстаны, і шмат ешчэ можна выцягнуць з яе; толькі на гэта патрэбна уменьне, навука, ды ешчэ адна драбніца: грошы. Ўсё ж такі ёсць і ешчэ адно поле да працы: гэта—рэмёслы. У Вялікарасеі і ў Сыбіры рэмесьнікі і дробные прамышленікі цягнуць не малые заработкі з гэтаго. Але каб яны працавалі так, як працуюць нашы рэмесьнікі, то гэтак сама заработкі іх не былі-б вялікіе.

Уся сіла расейскіх „кустароў“ (гэтак называюць там дробных рэмесьнікоў, што працуюць у сябе дома) у іх хаўрусах. Блізка па ўсіх большых вялікарускіх гарадох даўно ўжо пазакладаліся „арцелі“ (хаўрусы) рэмесьнікоў: сталяроў, сьлесароў ганчароў і др. Калі асобнаму чэлавеку цяжка здабыць грошы на інструмэнты і матэр'ялы, то гэта лёгка даецца хаўрусу. Асобнаму ремесьніку цяжка пазычыць грошы, а хаўрусу лёгка. Кустарные хаўрусы у Вялікарасеі дабываюць грошы такім парадкам: найперш складаюць хаўрус павэдле нормальнаго, апрацаванаго міністэрствам фінансоў уставу, пасьля плацяць членскую складку ў кассу хаўрусу (па 3, 5, 10 рублёў, ці болей с кожнай душы) і бяруць пазычку з банку, за гэтые грошы наймаюць кватэру, купляюць матэр'ялы, плацяць сваім хаўрусьнікам за выраблены імі тавар і даюць грошы на розные другіе расходы. Гэткім парадкам вялікарускі рэмесьнік-селянін мае работу і заработак, седзючы у сваей вёсцы, мае грошы на пачатак промыслу

У нашай Беларусі ні мала ёсць людзей, зручных да рознаго рэмесла, але заработак іх малы, бо яны ідуць паасобку, а каб залажыць які большы інтэрэс у іх нехапае грошы,—вось жэ будучына нашых хатніх промыслоў можэ быць толькі ў хаўрусох.

Пры прошлым нумэры мы разаслалі нашым чытачом кніжку: „Як багацеюць чэскіе селяне“, там расказываецца, якім парадкам чэскіе хлебаробы дайшлі да навукі і багацьця. Ішлі яны да гэтаго праз хаўрусы. Праз хаўрусы і хаўрусам і мы здалеем падняць сельскую гаспадарку і даць заработак тэй арміі нашых беларусоў, каторые выносяць свае лепшые сілы у чужые старонкі

**Л.**

## Копные суды.

Мінуўшчына беларускаго народу багата цікавымі формамі грамадзянскаго жыцьця Адна з гэткіх цікавых форм грамадзянскаго жыцьця XV—XVI сталецьця на Беларусі—гэта так-званые копные суды Копны суд выводзіўся з глыбокай старыны, с часоў родова—патрыархальных і сваімі формамі ён прыпамінае саўсім вечэ вялікіх гарадоў старой Русі. Старая форма копнаго суда ня знае розніцы становў: перад гэтым судом усе роўны ад найвысшаго да найнізшаго стану. Асобнасць копнаго суда была ў тым, што ён збіраўся заўсёды пад голым небам, на копных урочышчах, каторые у паганскіе часы, як відаць былі местам чэстваваньня багоў.

Копны суд знае дзьве формы: звычайную і гвалтоўную. Звычайная капа збіралася у загадзя вядомые судовые „рокі“ (срокі, тэрміны; адгэтуль польск. „вырок“—прыгавор судовы), каторые ў розных мейсцах адбываліся ў розные часы, а найчасьцей у такіе сьвяты, як Вялікдзень, Юрье, Зялёные сьияткі, Узьвіжчньне, Каляды. На звычайнай „простай“ капе разбіраліся справы, каторые мы цяпер назвалі бы „гражданскімі“: споры аб граніцы, аб борці, кражы, сваркі, бітвы, дзяліцьбу. На „лавах“ заседалі „старцы“, і яны судзілі разам з ўсей грамадой; пастанова суда была заўсёды „завітая“ (аканчацельная, безапэляціонная).—Гвалтоўная капа была заўсёды ешчэ і капой „гарачай“. Гэткая капа збіралася у прыпадках убіўства, падпалу, нападу. Скрыўджэны пачынаў крычаць—„падымаў гвалт“, і ўсе узрослые, хто пачуў „гвалт“, павінны былі ў той час бегчы на копнае мейсцо. І колькі збеглося народу, ўсе былі судзьдзямі, ўсе мелі роўны голас у судовай пастанове. Калі-ж праступнік—„гвалтоўнік“ — уцёк, ці схаваўся, то ўся „капа“ разам ішла гнаць „гарачы сьлед“. Калі гонячы гарачы сьлед, натраплялі на „гвалтоўніка“ у граніцах воласьці, то над ім тут-жэ пастанаўлялі прыгавор. Але бывало і так, што „гвалтоўнік“ уцекаў далей; тады гонячы гарачы сьлед, капа даходзіла да „мяжы“ (граніцы сваей воласьці) і тут засганаўлівалася, пасылала сваіх паслоў у суседнюю воласць і здавала ім „гарачы сьлед“. І тады ўсе страты і „навязку“ (штраф, пакрыцьце крыўды грашыма) павінна была плаціць тая воласць, але яна мела права у свой чарод гнаць гарачы сьлед і накладаць страты і навязку на другую воласць, калі сьлед туды пераходзіў, або на асобных людзей, каля каторых губіўся сьлед.

Гэткім парадкам копны суд, як судовая і сьледчая інстытуцыя, даволі добра спаўняў сваё назначэньне. Найбольшае развіцьце копных судоў прыпадае на XIII—XV сталецьця, у XVI сталецьці копные суды мала-памалу пачынаюць

паабшукалі, а ягнёнак бытцым скрозь донна праваліўся. Прайшоў ешчэ тыдзень і у другога гаспадара прапаў ягнёнак. Як ні шукалі і гэтаго не знайшлі Праз месяц згінуло тры ягнёнкі і парасё. Мужыкі закраталіся, сталі вартаваць ад лесу, бо думалі, што гэта ваўкі; як ні пільнавалі—ваўкоў не бачылі, а парасё ешчэ адно прапало, а за ім і другое. Як ня біліся, як ні ламалі галовы, як ня рупіліся мужыкі злавіць злодзея, нічога зрабіць не маглі Сёмка стаў саўсім маркотны і нечэга хадзіў па папарнаму полю ды усё прыглядаўся у балота. Чаго ён шукаў—нікому нічога не казаў.

Неяк пастухі пад Жвіранкай (гара з жвіру) гулялі у цуркі, а быдла хадзіла каля балота; ажно чуюць яны, як запішчыць парасё, ды так страшна, што усе чатыры яны разам пабеглі туды, скуль чуваць быў зык парася і круханьня сьвіньней, і бачаць, што нехта, дужа страшны, бытцым вялізная вужака, але з лапамі, як у яшчаркі, доўгі і тоўсты, як балька, а праз усю хрыбеціну, як у ірша, высокі грэбень, у бальшушчай ляпі трымаў за зад парасё і поўз у балота, а хвастом праганяў сьвіньней, што хацелі адбараніць парасё.

У той-жэ час пастухі пабеглі у вёску і расказалі сваім гаспадаром. Сабралася уся вёска прышоў і Сёмка ды і кажэ: „Казаў я вам, каб усіх вужак пабілі, каторые былі у бочцы с сокам, але відаць вы не даглядзелі і адна уцекла і схавалася у балоці. Беда цяпер будзе вам, бо гэта цмок, яго ніхто ня можэ забіць, апрыч сьвятога Іллі“.

Мужыкі і вушы павесілі, а кабеты разрымзаліся, бо усе ведалі, што цмоку мала будзе ягнят ці парасят, а захочэ і кароў ды і людзьмі не пачураецца.

Не ўзабавак усе уцікавілі, што надта часта бьецьс пяруна пад Жвіранкай, хоць сабе саўсім маленькая хмарка найдзець, а с пяруна разы тры ударыць.

Прайшоў ешчэ год, многа быдла папрадала у стрэльбянцоў, а на чацьвёрты год у Яські прапаў і пастушок. Стрэльбянцы, Гайсіляўцы і з другіх вёсак перасталі хадзіць і ездзіць па дарозі праз Жвіранку, бо баяліся, каб не спаткацца с цмокам.

Цікавы дзяцюк Юрка даўно ужо збіраўся паглядзець на цмока, але усё неяк не выпадала, усё страшна было Толькі у адну нядзелю, закінуўшы стрэльбу на плечы, пражагнаўся і пайшоў ешчэ да поўдня. Абыйшоўшы з другога боку Жвіранку, ён стаў з-загары прыгледацца на маленькае балоцітка, дзе жыў цмок. Якраз у гэты час надыйшла тучка; цмок вынырнуў з вады, стаў ракам, выставіў зад і давай балбатаць у вадзе; загрымеў гром, цмок ў тую-ж хвілю нырк у ваду, а с пяруна і трах, але нічога; цераз мінуту цмок ешчэ вынурнуў і давай балбатаць, а як загрымеў гром, дык нырў у ваду і схаваўся. Разы тры так рабіў, разы тры біло с пяруна—нічога Ведама, што ні пярун, ні куля, ні стрэла у вадзе не бярэць.

Юрка глядзеў, глядзеў і бачыць, што цмок дражніць сьв. Іллю, узяў стрэльбу і як цмок паказаўся з вады - бах у яго, цмок спужаўся, падумаў, што гром і нырнуў у ваду, але зара уцяміў, сваю абмылку і ізноў вытаркнуўся, але у тую хвілю, як ён хаваўся, прагрымеў гром, а як вынырнуў, ударыў пярун і якраз па ім; цмок перэвярнуўся да гары адзін раз, другі, і хацеў ужо перакульнуцца у большае балота, каторае было шагоў за дваццаць, ажно, як трэсьнець другі раз с пяруна, дык ён і расцягнуўся; а Юрка учуў з неба толькі адно слово: „дзякуй“.

Многа, дужа многа пераходзіло народу паглядзець цмока, толькі ніхто ня мог вытрываць: як паглядзіць, дык нудна станець, аж на ваніт бярэць, бо цмок той дужа ужо брыдкі і смуродны быў.

Колькі разоў закапывалі цмока у зямлю, але зраньня ізноў знаходзілі яго на вярху.

Як ня біліся, як ні мардаваліся, прыхадзілі з другіх вёсак памагаць,—нічога не маглі зрабіць.

Убачыў Сёмка, што шпэтны рэчы і кажэ мужыкам: „Сабярыце дванаццаць дзяцюкоў ні старэй дванаццаці гадоў і дванаццаць жэрабцоў, ешчэ ні разу не запрэганых, ніхай яны закапаюць цмока, але каб у адзін дзень“.

З далёкіх вёсак прышлося збіраць мальцоў і жэракоў, але затое яны у адзін дзень закапалі цмока.

Раз у нядзелю Сёмка, спаткаўшы Юрку, сказаў: „Прабачайце мне, многа я бяды нарабіў вам, хоць і не хацеў“, а сам пашоў у Краслаўку. С таго часу ніхто яго больш не бачыў.

Да гэтых пор ешчэ ёсць пагурак над Дзьвіной, што быў накапаны над цмокам; вялікае балота, выгарэло у сухое лета і прызываецца „Выгаркай“, а малое, дзе жыў цмок, і цяпер паўнюсенькае вады, толькі пазарасло мохам. Кажуць, што ад яго аж у Прысьвяцкае возеро, на пяць вёрст, ёсць лёха, за тое у ім і вада дужа сцюдзёная.

**Л. Гвозд.**

траціць сваё значэньне, бо с пад іх юрысдыкції (падсуднасьпі) пачынае выламывацца ўсё узрастаючая ў сілу і значэньне шляхта. Ў палавіне XVI сталецьця копные суды ўжо разбіраюць толькі справы паміж селянамі і справы „гвалтоўные“, а пад канец гэтаго сталецьця саўсім падупадае інстытут копных судоў, бо для шляхты устанавіліся ўжо крэпка суды „гродзкіе“, а селян судзіла сама шляхта. Але ўсё-ж такі, як далёкі адгалосак даўнейшых копных судоў, датрывалі на Беларусі, хаця і у зменёнай форме, паміж шляты суды „гранічные“ блізка што да палавіны XIX сталецьця. Гэткі „гранічны“ суд паміж шляхтай апісаў у пекнай паэме „*Pan Tadeusz*“ польскі пісьменьнік-паэта А. Міцкевіч, каторы быў родам з Беларусі (Мінск. губ., Новагрудз. пав.). Толькі пазьнейшые „гранічные“ суды, узяўшы ўсе формы старых копных судоў (бо гэтак сама адбываліся пад голым небам), ня мелі даўнейшых шырока дэмократычных і юрыдычных асноў: яны былі ўжо толькі чыста становай інстытуцией і разбіралі споры паміж шляхтай за-граніцы зямель.

**Власт.**

## Гэй наперад.

Гэй наперад, покі сэрцэ
Бьецца, рвецца на прастор!
Годзі млеці ў паняверцы;
Гэй да сонца! гэй да зор!

Хай бацькі стагналі ўчора,
Йшлі на той сьвет без пары;
Сённая ў нашай моцы горэ,
Мы жыцьця гаспадары!

Думка ў думку, дружна, сьмела
Усе наперад грамадой!
Кожны ведай сваё дзела,
Знай за праўду крэпка стой!

К новай долі шлях нам ляжэ,
Як на небі млечны шлях,
Слова, дум, ніхто не зьвяжэ;
Жыць, цярпець ня будзе страх!

І не стане больш пакуса
Першых лепшых з боку брацць
Славяніна-беларуса
Вечна ў лапці абуваць.

Дык наперад, покі сэрцэ
Бьецца, рвецца на прастор,
Годзі млеці ў паняверцы!
Гэй да сонца, гэй да зор.

**Янка Купала.**

## За працу!

Годзі плакаць і стагнаці,
Годзі сьлёзы ліць дарэмна;
Досі стогноў, досі енкоў:
Нікне праца пад'ярэмна.

Голас гучны, голас звонкі,
Дух бадзёры, гэй, прасьніся,
Пранясіся песьняй дзіўнай,
Думкай казкай адзавіся!

Нам парупіцца патрэба;
Люд прыспаны схамяніся:
Час на сьвет зірнуці сьмела;
С песьняй дружнай узніміся!

Нам ня грозны ўсе прашкоды,
Нам не страшны рэкі поту;
К ліху-ж жудасные думкі,—
Згодна выйдзем на работу.

Хай з вясёлай песьпяй праца
Хутка спорыцца у жыцьці.
Новых думак, песьняў, сьмеху
Не шкадуйце, пакажыце!

**Я. Журба.**

## З Беларусі і Літвы.

*(Ад ўласных карэспандэнтоў).*

**Мінск.** Адбылася ў Мінску выстаўка жывёлы, каторая вельмі добра удалася. Прычына гэтай удачы—гэта тое, што ў Міншчы не ёсць земства, каторае ажывіло жыцьцё сельскіх гаспадароў, ёсць шмат земскіх і правіцельственных агрономоў, каторые шчыра ўзяліся за працу. На выстаўку далі грошы казна, сельска-гаспадарскае таварыство і земство, усяго да 1,800 руб.

= Мінская паветовая земская управа начальнікам каторай цяпер прадседацель і член рады „націоналістоў“, Валіцкій, разаслала вучыцелём „анкетные“ лісткі с пытаньнямі, просячы атказаць на іх „с поўным даверьем і шчырасьцю“. Пытаньнёў шмат: і аб матэр'яльным палажэньні школы, аб групіроўцы дзяцей і шмат чаго іншаго. Далей ідуць пытаньня аб самым вучыцелю: што прымусіло вас пайсьці на атвецтвенную і цяжкую працу вучыцеля? Ці вы любіце сваю работу, ці толькі глядзіце на яе, як на заработак? Якіе у вас палітычные погляды? Якую партію у гасударстве вы уважаеце за найбольш патрэбную і спра вядлівую? Як адносіцеся да національнаго саюзу, як палітычнай партіі?

= Нідаўна ў Мінску сьвяткавалі 35-летнюю гадаўшчыну гасударственай службы губэрнатара Эрдэлі.

В. **Куковічы**, Мінск. губ. Слуцкаго пав. Прывязьлі сюды земскаго фэльчэра. Прыходзіць да фэльчэра і кабета, Марта К., ды просіць, каб фэльчэр агледзіў яе і даў якога зельля ад дуру ў галаве. Фэльчэр загадаў ей раздзецца. Калі яна скінула сарочку, то фэльчэр аж адступіўся назад: у яе на шыі ён убачыў вісячы жалезны замок, можэ с паўфунта вагой.—На што гэта?—„пытае“ фэльчэр. Яна яму атказала, што гэта адна знахарка параіла ей насіць ад дуру ў галаве. Фэльчэр засьмеяўся, ды сказаў кабеці: „Што гэта значыць гэткі замок? Лепей памагло-б можэ, каб ты пачапіла на шыю хаця паўпудовую гіру, тады можэ і дур і дурната вылезла-б з галавы!“ *Л.*

В. **Завалкі**, Мінск. губ. Слуцк. пав. У нас тут адзін чэлавек выйшоў у поле араць. Бачыць ён: на яго полі, на горцы нехта вырэзаў з зямлі крыжык. Чэлавек надта спужаўся, бо падумаў, што нехта ўжо падкапываецца пад яго і зрабіў крыжык на чары. Кінуў ён араць, ды барджэй запрогшы кабылу, паехаў да нейкаго знахара. Доўга ён цягнуўся па знахарох, ды шэптарох, пакуль яму нехта ня вытлумачыў, што крыжык зрабілі салдаты, як хадзілі па полі, ды нешта мерылі, ці знімалі можэ пляны.

Другі чэлавек знайшоў на сваім полі булку хлеба, фунтоў 10. Недзе, як ехалі поўначчу сваты, дык згубілі, бо хлеб лежаў нідалёка ад дарогі. І гэты чэлавек падумаў, што хлеб палажыў нехта знарочыста на чары, ды давай і ён старацца рады. Паехаў, прывёз сьвяшчэніка, каб ён памаліўся Богу, ды параскідаў чары. Але і пасьля гэтаго чэлавек той баяўся браць хлеб у рукі. На той час быў там адзін чэлавек з в. Куковічы, дык той падыйшоў, падняў з зямлі хлеб і падаў гаспадару ў рукі. Гаспадар жэ ледзь падыйшоў ня сьмелай паходкай ды узяў хлеб сваімі баязьлівымі дрыжачымі рукамі. Мне аб гэтым расказывалі хлопцы нашай вёскі А. і Б.— Б. Саазаў: „Вось, да чаго дайшла наша старана!“

Браты вучыцелі! Звертаюся да Вас ад усіх цёмных братоў-мужыкоў маіх, памажыце нам выбрацца з гэтаго балота, з гэтай цемнаты, памажыце, просім вас Богам! Падыміце наш край, нашу старонку, папрацуйце на нашай ніве, прынясіце і палажыце на аўтар прасьветы знаньне сваё, зблізьцеся да нас, прамоўце да нашаго сэрца нашай роднай мовай, а мы, беларусы, набудуемо вам вечные памятнікі ў сэрцах сваіх. Каб я мог, то напісаў-бы стацьцю на тэму: „Да чаго дайшла наша старонка?“ Але я не магу: мала вучыўся.

*Лявон Лобік.*

**Валожын**, Ашмянск. пав. У нашай старане народ вельмі любіць суды, але ешчэ больш любяць гэта нашые адвакацікі сваей гадоўлі, каторых завялося у нас парадна і іншые такіе мудрые, што хоць ты стой ды дзівуйся, як яны ёмка абрабляюць свае справы. Завядуцца с сабой браты, ці суседзі, або уздумаюць дзяльбу, зара да адваката; а яго доўга шукаць ня трэба. Кожную нядзельку і чэцьвер іх можна знайсьці у карчме на покуці. Там яны разглядаюць закон, падбіраюць стацьці, каторые трэба „апаласкаць“ і тады ужо адвакацік бярэцца за дзела, каторае іншы раз вядзе з двох канцоў: за аднаго ставіцца у судзе; а другому пішэ прашэньня. Бывае часам і так, другому нельга дасгупіцца да адвакаціка, бо ужо з ім засеў той с каторым су дзіцца, дык трэба ісьці да яго да хаты і занясьці парадны „сувісьцель“. А у судзе часам уселяк бывае і найчасьцей выігрывае толькі ... адзін адвакацік! Нідаўна з бліжэйшых нашых вёсак дзяліліся два браты і як гэта з давён вядзецца, пры дзяльбе прабдзёўб адзін другому галаву; той падаў у суд і вуездны член прыкінуў гэнаму тры месяцы адседкі, гэны недаволен і перэдаўся у акружны суд і там яму зменшылі кару на адзін месяц. „Добра і гэта, але усё-ж трэба сядзець, а тут рабочы час—сеўба. Вось ён ідзе да адваката параіцца, як тут зрабіць, каб адбыць кару пасьля сяўбы. Адвакат узяўся за нітачку і намахаўшы прашэньне сказаў занясьці у воласць пасьведчыць подпісь, бо ён быў не пісьменны. У воласьці, як прачыталі тое прашэньне, дык сталі усе рагатаць, бо там было гэтак напісана: „што ён нездаволен гэным судом і просіць прадоўжыць кару“. Выходзіло так, што заместа аднаго месяца ён сам сабе прасіў тры! І добра ешчэ, што пісар быў добры чэлавек і загадаў свайму памочніку напісаць прашэньне па людзку, а то, чаго добраго, гатовы былі да аднаго месяца далажыць ешчэ два. Быў і я у той час у воласьці і пытаюся: „скольві ж, вашэ, даў адвакату за гэткае прашэньне?“ А ён мне атказаў: „гатоўкі не даваў, але гэтак, па суседзку, шкалікоў с чатыры апаражнілі“.

*Стары Ўлас.*

**Высокі Двор**, Троцк. пав. Віл. губ. У нядзелю 3 чэрвеня у мястэчку Высокі Двор быў прыехаўшы інспэктар дробнаго крэдыту, сабраўшыеся вакалічные жыцелі, найбольш з памешчыкоў, залажылі крэдытна-зберэгацельную суполку. Членоў запісалося 25 чэлавек.

Арганізуецца гэтак сама селянска-хлебаробскі хаўрус. Хаўрусьнікоў пакуль-што запісалося толькі 47 асоб. Мястэчковые і вакалічные жыцелі падалі губэрнатару прашэньне, каб той пазволіў устроіваць у мястэчку што тыдзень кірмашы і апрача таго каб было 6 кірмашоў гадавых.

Правіцельство маніцца рабіць шосэ, ад Оліты да Ляндварова, каторая пойдзе праз Высокі Двор.

Цяпер колькі слоў аб самым мястэчку і ваколіцах.

Высокі Двор, гэта тыповае беларускае мястэчко заложэнае каля другой палавіны XVII сталецьця, мае касьцёл, цэркву, воласць, аптэку, манапольку, некалькіх піўных, некалькі крам, жыдоўскі хаўрусны банчок. Ляжыцця пры трактавай дарозі Трокі—Бутрыманцы (30 вёрст ад Трок).

Жыцелі беларусы і літоўцы. Займаюцца найбольш хлебаробствам. Жывуць бедна і цёмна. Многа шляхты але і тая нічым ня розніцца ад мужыкоў. У ваколіцы многа памешчыкоў але і тые паходзяць на сваіх суседоў, толькі некатарые ёсць, што варушацца.

*Праезды.*

**Коўна.** Адбыліся закладзіны падвалін пад народны літоўскі дом. Дом гэты будуецца за грошы, сабраные у Амэрыцы паміж літоўскімі эмігрантамі. У народным літоўскім доме будзе тэатр, бібліотэка, навучнае таварыство, музэй і мабыць нават рэдакціі літоўскіх газэт. Чэсць і слава літвінам за дружную грамадзкую працу!

## З усіх старон.

**Пецербург.** Нідаўна у Пецербурзе быў аткрыт банк пад фірмай „Петербурскій домъ Русской Промышленности“. Фундатар банка, Коровко, сядзіць цяпер у вастрозе за машэнства. Гэтымі днямі чыноўнік міністэрства ўнутрэных спраў, Гагарын, папрасіў, каб яму выдалі з банку 4 000 рублёў, што ён палажыў. Грошы ня выдалі. Гагарын пажаліўся пракурору. У банк прыйшоў пракурор с паліцией. Выявілося, што ў кассе банка лежало ўсяго капіталу 18 кап. Кассу апечаталі. Спаўняючаго павінасьці дырэктара, Амантова, і бухгальтэра Захаревскаго арэштавалі. Выявілося, што банкір Коровко растраціў больш мільёна рублёў. Банк гэты аткрыты быў пры помачы дэпутатоў-націоналістоў.

= На Выборгскай старане у лесі адбылася сходка забастоўшчыкоў-работнікоў. Сходку аступіла паліція. Работнікі разбегліся. Паліція стрэляла ў гару. Арэштавалі 14 работнікоў.

= Адбылася сходка 300 работнікоў мэталёваго заводу. Паліція разагнала забастоўшчыкоў.

= Чужаземные корэспандэнты паслалі сваім газэтам тэлеграмы, што міністр загадаў выпусьціць с пад арэшту Бэйліса.

**Варшава.** Забаставалі чатыры тысячы падмайстроў жыдоўскіх крам гатовай адзежы, вымагаючы большай платы за работу.

**Кацэрынослаў.** У ночы 8 грабежнікоў напалі на поезд, аграбілі на 11 тысяч касіра руско-бэльгійскаго таварыства і уцяклі. Забілі стражніка. Зранілі касіра і двох пасажыроў.

**Радом.** У ночы с 3 на 4 чэрвеня ператрэсла паліція багата жыцелёў у горадзі.

**Астрахань.** У Астраханскай губэрні паявілася саранча; наляцело яе гэтак многа, што мейсцамі поле і дарогі пакрыты ей гэтак тоўста, што праехаць цяжка. Паявілася саранча на поўдні Самарскай, Саратоўскай і Стаўрапольскай губэрні, а так-жэ ў Терскай, Кубанскай і Уральскіх Обласьцях. Яна ўсё з'едае на сваей дарозі, ўсякую зелень. Поле, па каторым прашла саранча, выглядае, як выголенае.

Рэдактар-Выдавец

**А. Ўласоў.**

Усе загранічные (ва ўсіх гасударствах Заходнай Эўропы і ў Паўночнай Амэрыцы) пачтовые канторы прыймаюць падпіску на „Нашу Ніву“ і самі дбаюць аб тым, каб газэта даходзіла акуратна. Дзеля гэтаго радзім нашым загранічным падпішчыкам не турбавацца с перасылкай грошы, а плаціць падпіску за „Нашу Ніву“ у сябе на почці.

Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.